# САРАЕЎСКАЕ ЗАБОЙСТВА: ПОГЛЯД ПРАЗ ГАДЫ



**Міхаіл ЦУБА,**
**кандыдат гістарычных навук**

**Больш як 95 гадоў таму, 28 чэрвеня 1914 года, у Сараеве быў забіты наследнік аўстра-венгерскага прастола эрцгерцаг Франц Фердынанд. Праз некалькі тыдняў пачалася Першая сусветная вайна. Вядома ж, галоўнымі прычынамі вайны былі эканамічныя супярэчнасці, якія прывялі да стварэння ваенных блокаў Антанты і Траістага саюза, а таксама палітычныя разыходжанні і нежаданне ўладных асоб знайсці кампраміс. Але ўсё ж менавіта забойства Франца Фердынанда і драма, звязаная з нацыянальна-вызваленчым рухам славянскіх народаў супраць аўстра-венгерскага панавання, сталі канкрэтнымі зачэпкамі, што выклікалі пачатак сусветнай бойні.**

## СФАЛЬСІФІКАВАНЫЯ ДАКУМЕНТЫ

Пра сараеўскае забойства напісана вельмі шмат. Аднак цікавасць да гэтай падзеі не слабее. З'яўляюцца разнастайныя даследаванні, аўтары якіх імкнуцца праліць святло на тыя ці іншыя загадкі. Што ўяўляла сабой арганізацыя «Млада Босна»? У якім асяроддзі і ўмовах даводзілася жыць і дзейнічаць яе прадстаўнікам? Як быў падрыхтаваны і ажыццёўлены замах на эрцгерцага?..

Размаітасць звестак і інтэрпрэтацый тлумачыцца тым, што фактычна ўсе даследаванні, у тым ліку і гэтае, грунтуюцца, на жаль, не на дакументах, а на ўскосных доказах, здагадках і інтуіцыі, паколькі арыгінальных дакументаў Міністэрства замежных спраў Сербіі таго перыяду проста не засталося. Ёсць толькі архіўныя матэрыялы, якія па некалькі разоў скарачаліся, падрабляліся, фальсіфікаваліся і свядома скажаліся.

Вядома, што пасля захопу аўстра-венгерскімі войскамі Сербіі ў пачатку Першай сусветнай вайны найбольш каштоўныя матэрыялы былі вывезены ў г. Тэрэзіянштат, дзе спецыяльнай камісіяй пад кіраўніцтвам начальніка аддзела генеральнага штаба Аўстра-Венгрыі фельдмаршала-лейтэнанта Аўгуста Урбанскі фон Астраміец і міністра па асаблівых даручэннях Панграца гэтыя дакументы былі дэтальна апрацаваны. Аб гэтым піша ў сваёй кнізе «Майстар шпіянажу» вядомы аўстрыйскі контрразведчык Макс Ронге, падкрэсліваючы, што рабілася «стылізацыя» згаданых матэрыялаў, дакументы самавольна скарачаліся і фальсіфікаваліся *[1, с. 102–103]*.

І ўжо 3 снежня 1915 года гэта дало магчымасць на аснове «сербскіх трафейных дакументаў» надрукаваць у венгерскай газеце «Пештэр лойд» сенсацыйны артыкул «Трыццаць гадоў тайнай дыпламатыі Расіі на Балканах». У ім даказвалася, што расійскія і сербскія кіруючыя колы на працягу многіх гадоў былі задзейнічаны ў варожай, падрыўной рабоце супраць Аўстра-Венгрыі *[2, л. 278]*.

Затым большасць матэрыялаў была накіравана ў Вену, дзе працягвалася іх далейшая апрацоўка ў патрэбным для Аўстра-Венгрыі кірунку. Пасля чаго было дазволена істотную частку дакументаў набыць былому паверанаму ў справах Сербіі ў Берліне М. Багічавічу, які перайшоў на бок Германіі. У сувязі з публікацыяй гэтых матэрыялаў югаслаўскі ўрад у афіцыйнай ноце ад 2 лютага 1929 года паведамляў: «Зборнік Багічавіча складзены з украдзеных у нас архіўных дакументаў. Яго матэрыялы тэндэнцыйна зменены і маюць як купюры, так і аўтарскія дапаўненні. Яго публікацыя заснавана на зусім неверагодных даных» *[3, с. 17]*.

Аднак на гэтым прыгоды з дакументамі, дзе меліся звесткі аб развязванні Першай сусветнай вайны, не скончыліся. У красавіку 1941 года пад час германскага нападу на Югаславію частка мясцовых архіваў па загаду акупацыйных улад была вывезена ў Вену. Пасля гэтага ўсё паўтарылася: зноў была створана спецыяльная камісія на чале з Розенбергам па адпаведнай «апрацоўцы» матэрыялаў, у якую ўваходзілі ўжо вопытныя аўстрыйскія «спецыялісты»-фальсіфікатары, а таксама шэраг вядомых нямецкіх гісторыкаў (А. Бітнер, Л. Хаек і іншыя). Камісія павінна была прывесці дакументы ў такі

стан, які яскрава сведчыў бы, што Расія і Сербія рыхтавалі вайну з Аўстра-Венгрыяй яшчэ ў перыяд баснійскага крызісу, ствараючы ў 1908–1909 гадах на тэрыторыі Сербіі шматлікія антыаўстрыйскія тэрарыстычныя арганізацыі, якія з цягам часу і ажыццявілі сараеўскае забойства. З гэтай мэтай камісія меркавала выдаць восем тамоў «сербскіх і югаслаўскіх трафейных дакументаў», аднак паспела падрыхтаваць для публікацыі толькі адзін, які ахопліваў перыяд баснійскага крызісу 1908–1909 гадоў *[3, с. 17]*.

Пасля Другой сусветнай вайны гэтыя дакументы былі вернуты Югаславіі, але ж у іх недакладнасці і фальсіфікацыі сумнявацца не даводзіцца.

Тым не менш, аналізуючы крок за крокам самыя розныя звесткі, хацелася б яшчэ раз зазірнуць у таямніцы сараеўскага забойства. Забойства, якое звязала ў адзінае цэлае абедзве сусветныя вайны, бо пад лозунгам «славянскай небяспекі», спасылаючыся на аўстра-венгерскі ўльтыматум ад 23 ліпеня 1914 года, Гітлер распачаў ваенныя дзеянні ў 1941 годзе не толькі супраць Югаславіі, але і супраць СССР.

## «ЧОРНАЯ РУКА» І «МЛАДА БОСНА»

Пасля анексіі Босніі і Герцагавіны Аўстра-Венгрыяй (1908) на тэрыторыі Босніі была створана законспіраваная афіцэрская арганізацыя «Аб’яднанне альбо смерць», вядомая таксама пад назвай «Чорная рука». Яе кіраўніком быў былы палкоўнік сербскай разведкі Дзімітрый Дзімітрыевіч па мянушцы Апіс («свяшчэнны бык») *[4, с. 61]*. Галоўная мэта «Чорнай рукі» – стварэнне незалежнай дзяржавы ў выніку аб’яднання Сербіі і Босніі. Гэта арганізацыя пад сваёй апекай мела асобныя баявыя атрады «Млада Босна», «Народна одбрана» і іншыя, якія адрозніваліся адзін ад аднаго мэтамі і спецыфікай выканання заданняў, а таксама ўзростам удзельнікаў.

У перыяд з 1910 па 1914 год гэтыя атрады правялі шэраг тэрарыстычных актаў супраць аўстра-венгерскіх чыноўнікаў рознага рангу на землях Босніі. Але асаблівую нянавісць у дзеячаў славянскага нацыянальна-вызваленчага руху выклікалі члены імператарскай сям’і Аўстра-Венгрыі і асабіста эрцгерцаг Франц Фердынанд, які прапаноўваў даць больш шырокія правы і магчымасці славянскаму насельніцтву імперыі для яго актыўнага ўдзелу ў кіраванні дзяржавай. Такімі прапановамі Франца Фердынанда былі незадаволены ўсе: аўстрыйскія і венгерскія чыноўнікі не хацелі адмаўляцца ад пераваг, што мелі іх народы ў палітычнай структуры імперыі; у сваю чаргу, лідэры славянскага нацыянальна-вызваленчага руху баяліся, што разладзяцца іх планы па стварэнні ўласнага паўднёва-славянскага каралеўства *[4, с. 61]*.

Увогуле Франц Фердынанд быў адным з самых загадкавых палітыкаў не толькі ў Аўстра-Венгрыі, але і сярод усіх еўрапейскіх каранаваных асоб. Ён нарадзіўся 18 снежня 1863 года ў сям’і Карла Людвіга (брата аўстра-венгерскага імператара Франца Іосіфа). Пасля смерці маці – прынцэсы Антоніі (1871), якая паходзіла з дынастыі Бурбонаў, хлопчыка выхоўвала мачаха Марыя Тэрэза Браганская. Наследнікам аўстра-венгерскага трона ён стаў, можна сказаць, выпадкова. 30 студзеня 1889 года ў паляўнічым замку Меерлінг скончыў жыццё самагубствам адзіны сын Франца Іосіфа эрцгерцаг Рудольф. Пасля гэтага наследнікам стаў Карл Людвіг, бацька Франца Фердынанда, а апошні ў сваю чаргу стаў наследнікам прастола ўжо пасля смерці Карла Людвіга 19 мая 1896 года. Аднак неўзабаве навааўлены наследнік стаў галоўным віноўнікам чарговага дынастычнага крызісу. Падставай для гэтага паслужыў марганатычны шлюб Франца Фердынанда з графіняй Сафіяй Хотэк, якая паходзіла з чэшскага арыстакратычнага роду. Франц Іосіф даў згоду на гэты шлюб, але ўсё ж адносіны паміж ім і пляменнікам былі безнадзейна сапсаваныя. Франц Фердынанд меў даволі значны аўтарытэт сярод розных кіраўнікоў еўрапейскіх краін. Асабліва цёплыя ўзаемаадносіны звязвалі яго сям’ю з германскім імператарам Вільгельмам ІІ. Вядома, што ў сваіх уладаннях кайзер аказваў такую ўвагу і павагу Сафіі Хотэк (пасля шлюбу яна атрымала тытул герцагіні Гогенберг), на якія яна ніяк не магла разлічваць пры венскім двары *[5, с. 625–627]*.

Тым часам вялікую трывогу сярод баявых арганізацый, якія дзейнічалі ў Сараеве,

**ЦУБА**
**Міхаіл Віктаравіч.**
Нарадзіўся ў 1957 годзе ў в. Навіна Салігорскага раёна Мінскай вобласці. У 1985 годзе скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М. Горкага.
У 1986–1987 гадах працаваў у Бранчыцкай школе ў Салігорскім раёне. У 1988 годзе – выкладчык горна-хімічнага тэхнікума ў Салігорску. З 1989 па 1991 год – навуковы супрацоўнік Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея. Пасля заканчэння аспірантуры працаваў у Салігорскім райвыканкаме (1996–2001). З 2001 года – у Пінскім вышэйшым банкаўскім каледжы (з 2006 года – Палескі дзяржаўны ўніверсітэт), дацэнт кафедры гуманітарных навук, філасофіі і права ПДУ.
Кандыдат гістарычных навук (1996).
Аўтар больш як 50 навуковых публікацый.
Сфера навуковых інтарэсаў: грамадска-палітычнае жыццё і ваенныя дзеянні ў гады Першай сусветнай вайны.

выклікалі слухі аб намерах эрцгерцага Франца Фердынанда ўладкаваць на прастол Босніі і Герцагавіны аднаго са сваіх сыноў. Гэтыя размовы раздражнялі ўсе мясцовыя нацыянальныя групоўкі, але асаблівай актыўнасцю вызначалася створаная ў 1910 годзе «Млада Босна», у якую ўваходзілі рашучыя маладыя людзі сербска-баснійска-герцагавінскага і харвацкага паходжання, гатовыя ахвяраваць сваім жыццём дзеля радзімы. Важную ролю ў гэтай арганізацыі адыгрывалі Мілаш П'яніч, Нядзелька Чабрынавіч, Даніла Іліч, Гаўрыла Прынцып, але фактычна лідэрам суполкі младабаснійцаў быў герцагавінскі паэт Уладзімір Гачынавіч. Як ідэйны натхняльнік, ён у сваіх творах апяваў подзвігі герояў-адзіночак, лічыў, што такі кірунак дзейнасці прынясе грамадству значна больш карысці, чым масавае рэвалюцыйнае выступленне.



Гаўрыла Прынцып у турме

Вершы «Крык адчаю» і «Смерць аднаго героя» У. Гачынавіч прысвяціў баснійскаму змагару Багдану Жэраічу, які загінуў у 1910 годзе пад час замаху на аўстрыйскага намесніка ў Босніі М. Варашаніна. Месца пахавання Б. Жэраіча ў Сараеве на гарадскіх могілках стала звычайным пунктам збору младабаснійцаў. Тут гучалі клятвы прадаўжаць справы героя-баснійца і помсціць за яго смерць. Пазней Г. Прынцып выказаў думку, што яго рашэнне прысвяціць жыццё барацьбе за лепшае будучае свайго народа канчаткова выспела менавіта ў гэты час. «Яшчэ будучы ў Сараеве, я вырашыў зрабіць замах. Я шмат разоў прыходзіў на магілу Жэраіча, знаходзіўся там усю ноч і думаў пра нашы справы, пра цяжкае становішча нашага народа, і тады прыняў рашэнне» *[3, с. 20]*.



Франц Фердынанд

Вядома, што младабаснійцы чыталі рэвалюцыйную літаратуру расійскіх аўтараў С. Нячаева, М. Бакуніна, П. Ткачова, П. Крапоткіна. У 1912–1914 гадах адбылося некалькі сустрэч Льва Троцкага (у той час карэспандэнта газеты «Киевская мысль») з Уладзімірам Гачынавічам. Пад час адной з іх Гачынавіч заявіў Троцкаму: «Мы – ваша ідэйная калонія, а калонія заўсёды павінна ісці за метраполіяй» *[6, с. 4]*.

Але асаблівы ўплыў на членаў «Млады Босны» аказала літаратура, якая датычылася расійскай арганізацыі «Народная воля», створанай у 1879 годзе. Наколькі грунтоўна і дэталёва вывучаліся дзеянні нарадавольцаў младабаснійцамі сведчыць той факт, што тэракты 1881 і 1914 гадоў не проста падобныя паміж сабой – гэта замахі-блізняты. Фактычна па сцэнарыі забойства расійскага цара младабаснійцы расставілі на шляху эрцгерцага ў ратушу сваіх людзей. Калі бомба, кінутая Нядзелькам Чабрынавічам, не пашкодзіла Францу Фердынанду, Гаўрыла Прынцып, дачакаўшыся яго вяртання з ратушы, усё ж учыніў забойства. І не дзіўна, што натхняючым прыкладам для дзеянняў младабаснійцаў быў не толькі Б. Жэраіч, але жыццё і барацьба Соф'і Пяроўскай, Андрэя Жалябава, Мікалая Кібальчыча і, найперш, Ігната Грынявіцкага, забойцы Аляксандра II, нашага суайчынніка, ураджэнца Мінскай губерні.

## ФАТАЛЬНЫЯ ВЫСТРАЛЫ

Аднак каб зрабіць правільныя высновы, разгледзім больш падрабязна тыя падзеі, якія сталі прычынай для пачатку Першай сусветнай вайны.

Пад канец чэрвеня 1914 года Аўстра-Венгрыя ў мэтах псіхалагічнага ўздзеяння на Сербію вырашыла правесці на баснійскай тэрыторыі побач з сербскай граніцай ваенныя манеўры. Даведаўшыся з газет, што пасля заканчэння манеўраў 28 чэрвеня 1914 года наследнік аўстра-венгерскага трона наведае Сараева, кіраўніцтва «Чорнай рукі» і «Млады Босны» вырашыла скарыстаць зручны момант для замаху.

Франц Фердынанд, каб падкрэсліць сяброўскія мэты візіту, узяў у паездку сваю жонку Сафію Гогенберг. Нягледзячы на гэта, усё ж нельга трактаваць паездку эрцгерцага ў сталіцу Босніі як бяскрыўдную прагулку. Сур'ёзнай правакацыяй былі самі ваенныя манеўры, што праводзіліся на граніцы з Сербіяй. Акрамя таго, наўмысна ці не, выбраная дата візіту 28 чэрвеня была днём Святога Віда, які славянскія народы Балкан адзначалі як Дзень памяці ў сувязі з 525-й гадавінай бітвы на Косавым полі. Тады ў 1389 годзе турэцкія войскі разбілі аб'яднаную сербскую армію, і балканскія славяне на многія стагоддзі падпалі пад турэцкі прыгнёт. Такім чынам, падзеі мінулага падагравалі і

без таго напружаныя абставіны візіту Франца Фердынанда ў Сараева. Аднак ён загадаў, каб прадстаўнікі вайсковага кантынгенту ў горадзе і паліцыя былі аддалены ў час праезду і не перашкаджалі свабоднаму доступу народа да яго асобы. Гэта і было выкарыстана змоўшчыкамі. Пад час руху картэжа ў машыну наследніка кідалі букеты кветак. У адным з гэтых букетаў была схавана бомба, якая трапіла ў прыпол адзення Сафіі Гогенберг, адскочыла назад і выбухнула пад коламі наступнага аўтамабіля. Двое афіцэраў аховы былі паранены, а кідальнік бомбы Нядзелька Чабрынавіч тут жа арыштаваны. Нягледзячы на гэты інцыдэнт, Франц Фердынанд прадоўжыў паездку да ратушы, дзе была праведзена тэрміновая нарада і прынята рашэнне аб змяненні маршруту выезду з горада. Аднак, па дзіўнаму збегу абставін, шафёр эрцгерцага пераблытаў маршрут, паехаўшы ранейшым шляхам, дзе чакалі выканаўцы тэракта з «Млады Босны» – Гаўрыла Прынцып і Даніла Іліч. Першы з іх, ускочыўшы на падножку адкрытага аўтамабіля, з рэвальвера застрэліў Франца Фердынанда і яго жонку. У хуткім часе Дзімітрыевіч і Іліч, як арганізатары тэрарыстычнага акта, былі пакараны смерцю. А непасрэдныя выканаўцы, Прынцып і Чабрынавіч, у сувязі з тым, што былі непаўналетнія, зняволены ў аўстрыйскую турму *[4, с. 62]*.

Так сараеўскія выстралы далі пачатак ваеннаму процістаянню вядучых дзяржаў свету. Лёс жа саміх младабаснійцаў быў не менш трагічны, чым лёс народаў розных краін, уцягнутых у сусветную вайну. У 1917 годзе пры загадкавых абставінах памёр лідэр «Млады Босны» Уладзімір Гачынавіч. Ёсць версія, што ён быў атручаны сваімі саратнікамі, якія такім чынам вырашылі адпомсціць яму за рэпрэсіі з боку аўстра-венгерскіх улад. Што да Гаўрылы Прынцыпа, то яго жыццёвы шлях скончыўся ў гарадской турме Тэрэзіянштата 28 красавіка 1918 года. Прынцып быў тайна пахаваны ў турэмным двары, а ў 1920 годзе яго астанкі перапахавалі ў брацкай магіле на сараеўскіх могілках разам з іншымі памерлымі і закатаванымі ўдзельнікамі замаху. У час кіравання Югаславіяй І.Б. Ціта на магіле быў пастаўлены помнік, а ў Сараеве ў іх гонар адкрыты музей «Млада Босна». Аднак у 1990-я гады мусульманамі-нацыяналістамі музей быў разбураны, а магіла апаганена *[3, с. 22]*.

***

Аналізуючы падзеі, звязаныя з сараеўскім забойствам, хацелася б адзначыць, што эрцгерцаг Франц Фердынанд і яго жонка былі забіты пры поўнай бяздзейнасці з боку іх аховы. Як паказалі следства і судовы працэс у сакавіку – чэрвені 1917 года ў Салоніках, сербскі ўрад не меў дачынення да гэтага тэракта, але ведаў, што замах рыхтуецца, і своечасова не прадухіліў яго. Не было непасрэдных доказаў вінаватасці і адносна арганізацыі «Чорная рука», але не было і сумненняў, што арганізацыя пад кіраўніцтвам палкоўніка Дзімітрыя Дзімітрыевіча дала младабаснійцам зброю, настаўляла і рыхтавала іх да тэрактаў. Ажыццяўляючы замах, прадстаўнікі арганізацыі «Млада Босна» нават не здагадваліся, што гэты тэракт прывядзе да сусветнай вайны.

Аднак было б памылкай лічыць, што младабаснійцы пад час забойства эрцгерцага апынуліся на месцы здарэння па нейкіх выпадковых абставінах. Такі падыход пярэчыць самой іхняй ідэі. Таму што іх погляды былі заснаваны на ахвяраванні сваім жыццём у імя справядлівасці, свабоды і роўнасці, дзеля нацыянальнага вызвалення свайго народа і будаўніцтва яго дзяржаўнасці. Для дасягнення гэтай мэты младабаснійцы былі гатовы на любы гераічны ўчынак. А ў рэшце рэшт, імкнучыся дасягнуць сваіх высокіх ідэалаў, яны далі штуршок да сусветнай бойні народаў. І гэта заканамерны фінал, бо любая спроба зрабіць перамены ў бок лепшага з дапамогай сілы (замахаў, тэрактаў, бунтаў, рэвалюцый, войнаў і гэтак далей) асуджана на правал і цягне за сабой велізарныя людскія і матэрыяльныя страты.

І ўсё ж, нягледзячы на недахопы і памылкі, характэрныя для нацыянальна-вызваленчага руху славянскіх народаў Балканскага паўвострава супраць аўстра-венгерскага прыгнёту, неабходна адзначыць, што некаторыя паслядоўныя і рашучыя крокі на аднаўленне сваёй дзяржаўнасці, зробленыя славянскімі дзеячамі і створанымі імі арганізацыямі (у тым ліку «Чорнай рукой», «Младай Боснай»), заслугоўваюць увагі і вартыя нашай памяці. ■

**ЛІТАРАТУРА**

1. Ronge, M. Meister der Spionage / M. Ronge. – Leipzig, 1925. – 127 s.
2. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. – Ф. 1420. – Воп. 2. – Спр. 21.
3. Писарев, Ю. «Наши дети будут ходить по Вене...» / Ю. Писарев // Родина. – 1993. – № 8–9. – С. 16–22.
4. Цуба, М.В. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі з пачатку Першай сусветнай вайны да Лютаўскай рэвалюцыі (жнівень 1914 – люты 1917). Матэрыялы да курса «Гісторыя Беларусі» / М.В. Цуба. – Мн.: АртыФэкс , 2006. – 231 с.
5. Залесский, К.А. Кто был кто в Первой мировой войне / К. А. Залесский. – М.: ООО «Издательство АСТ», ООО «Издательство Астрель», 2003. – 894 с.
6. Trocky, Z. Sarajevsky atentat. Ispoved Vladimira Gacinovica / Z. Trocky // Edition slave. – Wien, 1922. – № 1. – P. 4.